М.Л.Кузьмініч
(кафедра народна-інструментальнай творчасці)

# АБ ПЕРАХОДЗЕ ДА ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ МУЗЫКАНТАЎ

У цяжкім фінансавым становішчы апынуліся ўстановы культуры, у тым ліку і навучальныя. Шукаючы выхаду з крызісу, Міністэрства культуры прымае пэўныя захады, каб, у прыватнасці, пазбегнуць дубліравання ў падрыхтоўцы кадраў і тым самым сэканоміць фінансавыя і матэрыяльныя сродкі. Гэта ў першую чаргу тычыцца Інстытута культуры. У выніку праведзенай Міністэрствам праверкі Інстытуту было прапанавана знайсці "свой" напрамак у падрыхтоўцы кадраў для ўстаноў культуры, удакладніць пералік спецыяльнасцяў, аб'яднаць шэраг кафедраў і інш.

У той жа час ні Міністэрства, ні падведамасны яму Беларускі Інстытут праблем культуры не прадставілі навукова абгрунтаванага прагнозу развіцця ўстаноў культуры і адпаведных патрэб згаданай сферы ў кадрах пэўных спецыяльнасцяў. У выніку калектыў Інстытута апынуўся ў складаным становішчы, калі ад яго патрабуюць кардынальных змен, не вызначыўшы пры гэтым мэты ў выглядзе мадэлей спецыялістаў рознага профіля.

Але, улічваючы агульную арыентацыю сферы адукацыі на заходнія ўзоры, імкненне прывесці падрыхтоўку кадраў да міравых стандартаў, а таксама перабудову эканамічных асноў грамадства ў тым жа (заходнім) накірунку, адным з напрамкаў у вырашэнні пастаўленай Міністэрствам задачы па ўдасканаленню структуры і дзейнасці Інстытута можа стаць вывучэнне практыкі падрыхтоўкі кадраў у адпаведных ВНУ Захаду. Як жа там арганізаваны працэс падрыхтоўкі кадраў у галіне музычнага мастацтва?

Першае, што хочацца адзначыць, гэта тая ўвага, якая надаецца музычнаму выхаванню дзяцей у агульнаадукацыйных школах. Адпаведна, усе сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы ў большай ці меншай ступені рыхтуюць кадры менавіта для агульнаадукацыйных школ.

Так, у Нямеччыне настаўнікаў музыкі для агульнаадукацыйных школ (пачатковыя класы) рыхтуюць педагагічныя, выхаваўча-навуко-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вые і агульныя вышэйшыя школы. Вышэйшыя музычныя школы, кансерваторыі, акадэміі выпускаюць выканаўцаў, прыватных настаўнікаў музыкі, педагогаў музычных і агульнаадукацыйных (сярэдніе і старэйшыя класы) школ. Вельмі часта адны і тыя ж выкладчыкі працуюць у музычных і агульнаадукацыйных школах. Таму ў ВНУ назіраецца імкненне да уніфікацыі вучэбных праграм і экзаменацыйных патрабаванняў пры падрыхтоўцы спецыялістаў. У апошні час у вышэйшых музычных школах з'явіліся новыя спецыялізацыі для падрыхтоўкі музычных бібліятэкараў, інструментальных майстраў, ваенных музыкантаў, гукааператараў і гукаінжынераў, педагогаў-выканаўцаў для агульнаадукацыйных школ і дзіцячых тэатраў, педагогаў для цэнтраў свабоднага часу.

У Фінляндыі выкладчыкі музыкі I-VI класаў агульнаадукацыйных школ скончылі, як правіла, школьныя аддзяленні універсітэтаў (2 або 4 гады навучання). У старэйшых класах выкладаюць выпускнікі Музычнай Акадэміі імя Сібеліуса і Музычных Універсітэтаў (5-6 год навучання), якія размяркоўваюцца таксама ў прафесійныя калектывы, музычныя школы, каледжы, кансерваторыі.

У Англіі для пачатковых класаў агульнаадукацыйных школ настаўнікаў рыхтуюць музычныя каледжы, а для сярэдніх і старэйшых класаў - музычна-педагагічныя факультэты універсітэтаў (4 гады навучання). Пры гэтым студэнты на працягу 3 год атрымліваюць музычную падрыхтоўку, а чацверты - педагагічную. Выпускнікі павінны ўмець: іграць на богаслужэннях, кіраваць хорам, ансамблем, аркестрам; вучыць ігры на інструменце; ставіць голас; засвоіць вакальную педагогіку і хоразнаўства; валодаць 3 музычнымі інструментамі (фартэпіяна, скрыпка, [illegible]родны (духавы) інструмент). Выпускнікі Музычнай Акадэміі пра[illegible]юць у прафесійных калектывах, альбо запісваюцца на дадатковыя педагагічныя курсы дзеля атрымання педагагічнай кваліфікацыі.

У ЗША музычную адукацыю [illegible] набыць у каледжах з атрыманнем звання бакалаўра (4 гады навучання), магістра-майстра (5 год навучання), доктара музыкі (7 год навучання). Каледжы дзеляцца на выканаўчыя, музыказнаўчыя, педагагічныя. Вышэйшую музычную адукацыю даюць таксама музычныя факультэты універсітэтаў па наступных спецыяльнасцях: музычная адукацыя, музычная гісторыя і крытыка, музыка (выканаўства, кампазіцыя, тэорыя),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музыка (зводныя мастація праграмы).

Такім чынам, можна зазначыць, што музычныя навучальныя установы на Захадзе спецыяльна не рыхтуюць кадры для кіраўніцтва аматарскімі калектывамі. Выпускнікі Вышэйшых музычных школ працуюць не толькі ў прафесійным мастацтве, але (як і выпускнікі музычных факультэтаў Універсітэтаў) і ў агульнаадукацыйных школах. Хаця адзіныя планы падрыхтоўкі кадраў адсутнічаюць, тым не менш наглядаецца тэндэнцыя да уніфікацыі вышэйшай музычна-педагагічнай адукацыі. Пасля поўнай музычна-тэарэтычнай і выканальніцкай падрыхтоўкі студэнты Вышэйшых музычных школ слухаюць курс музычнай педагогікі. У адпаведнасці з праслуханым курсам студэнт атрымоўвае званне бакалаўра, магістра (майстра), або доктара музыкі і займае адпаведную пасаду ў грамадстве.

У святле сказанага вышэй, дзейнасць Беларускай акадэміі музыкі і музычнага факультэта Педагагічнага інстытута адпавядае напрамкам работы музычных ВНУ на Захадзе. Што тычыцца Інстытута культуры, то яму, відаць, трэба адмовіцца ад падрыхтоўкі кіраўнікоў аматарскіх калектываў для устаноў культуры як адзінага і пры тым галоўнага накірунка дзейнасці. Найбольш перспектыўнай і мэтазгоднай, на наш погляд, будзе выглядаць педагагізацыя зместу вучэбнага працэсу - арыентацыя яго выпускнікоў на работу ў агульнаадукацыйных школах (сярэднія і старэйшыя класы, школьныя аркестры, ансамблі, хоры, тэатры, танцавальныя калектывы), у школах з музычна-харавым, тэатральным альбо харэаграфічным ухілам, а таксама у Школах мастацтваў і дасугавых цэнтрах. У адрозненне ад музычнага факультэта Педагагічнага інстытута падрыхтоўка спецыялістаў у Інстытуце культуры павінна быць больш шырока скіравана на па-зашкольную работу, мець глыбейшую музычную (тэарэтычную і практычную) падрыхтоўку і нацыянальную (фальклорную) афарбоўку. На нашу думку, выпускнікі мастацкіх спецыялізацый Інстытута культуры змаглі б весці на высокім прафесійным узроўні не толькі урокі музыкі, але і забяспечыць выкладанне прадмета "Гісторыя сусветнай мастацкай культуры", вучыць ігры на музычных інструментах, кіраваць хорам, аркестрам, ансамблем, праводзіць школьныя культурна-масавыя мерапрыемствы.

У 1989-92 гг. у вучэбна-выхаваўчым працэсе на кафедры аркестравага дырыжыравання адбыліся станоўчыя змены, у выніку ча-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

го змест навучання у большай ступені набыў адметныя нацыянальныя рысы, былі ўдасканалены вучэбныя планы, пачалася профільная падрыхтоўка спецыялістаў па двум асноўным накірункам (кіраўнік аркестра народных інструментаў і кіраўнік ансамбля народных інструментаў) і двум дадатковым (канцэртмайстар, выкладчык).

У той жа час пераход ВНУ рэспублікі да шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў патрабуе далейшага ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу на кафедры з выкарыстаннем станоўчага вопыта у сістэме адукацыі развітых краін свету. З гэтай нагоды намі быў распрацаваны план-прагноз дзейнасці кафедры ва ўмовах шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне народна-інструментальнай творчасці.

З пераходам да шматузроўневай падрыхтоўкі музыкантаў структура вучэбнага працэса на кафедры аркестравага дырыжыравання бачыцца нам наступнай:

I. На I-II курсах студэнты атрымліваюць шырокую агульнаадукацыйную, глыбокую гуманітарную, вышэйшую музычную адукацыю. Па выніках атэстацыі за II курс вызначаецца профіль далейшай падрыхтоўкі студэнтаў - кіраўнік аркестра ці кіраўнік ансамбля.

Калі імкнуцца да тыднёвай нагрузкі студэнтаў на пачатковых курсах у памерах 28 гадзін у тыдзень (адпаведна Загаду Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР № 660 ад 22.09.86 г.), то на спецыяльныя прадметы трэба адвесці не больш за I4 гадзін (ва універсітэтах ЗША на грамадазнаўчы і гуманітарны цыклы адводзіцца 50-66% гадзін на першым этапе навучання). У гэтую колькасць, на нашу думку, не павінны ўваходзіць індывідуальныя заняткі па спецыяльнасці, бо мы іх разглядаем як самастойную работу студэнта над музычным творам пад кіраўніцтвам выкладчыка. Такім чынам, 28 гадзін у тыдзень складаюць грамадазнаўчыя, агульнаадукацыйныя дысцыпліны, лекцыйныя і групавыя заняткі па спецыяльнасці. У такім выпадку вучэбны план спецыялізацыі (раздзел "Спецыяльныя дысцыпліны") стане выглядаць наступным чынам: (глядзі тамбліцу № I на наступнай старонцы).

У прыведзеным плане на групавыя заняткі па спецыяльнасці адводзіцца I0-I2 гадзін у тыдзень (36-43% агульнага вучэбнага часу). Адпаведна, на грамадазнаўчы і агульнаадукацыйны цыклы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Табліца I.

| Курс | I | | | | II | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Семестр | I | | 2 | | 3 | | 4 | |
| Форма заняткаў | груп. | інд. | груп. | інд. | груп. | інд. | груп. | інд. |
| ДЫСЦЫПЛІНЫ: | | | | | | | | |
| I.Аркестравы клас | 6 | – | 6 | – | 6 | – | 6 | – |
| 2.Дырыжыраванне | – | 2 | – | 2 | – | 2 | – | 2 |
| 3.Спецінструмент | – | 2 | – | 2 | – | 2 | – | 2 |
| 4.Дабавачны (фальклорны) інструмент | – | I | – | I | – | I | – | I |
| 5.Інструментоўка | – | – | – | – | 2 | – | – | I |
| 6.Чыт.арк.партытур | – | – | – | – | – | – | – | I |
| 7. Фартэпіяна | – | I | – | I | – | I | – | I |
| 8.Сальфеджыа | 2 | – | 2 | – | 2 | – | 2 | – |
| 9.Гармонія | 2 | – | 2 | – | – | – | – | – |
| I0.Паліфонія | – | – | – | – | 2 | – | – | – |
| II.Аналіз муз.твораў | – | – | – | – | — | – | 2 | – |
| Тыднëвая нагрузка па дысцыплінах спецыялізацыі (улічваючы толькі групавыя заняткі) – гадзін | I0 (35,7%) | | I0 (35,7%) | | I2 (42,9%) | | I0 (35,7%) | |
| Тыднëвая нагрузка па грамадазнаўчых і агульнаадукацыйных прадметах – гадзін | I8 (64,3%) | | I8 (64,3%) | | I6 (57,I%) | | I8 (64,3%) | |
| УСЯГО (гадзін) | 28 (I00%) | | 28 (I00%) | | 28 (I00%) | | 28 (I00%) | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

застаецца 16–18 гадзін у тыдзень (ці 57–64% часу). Вытрымання прапорцыі адпавядаюць амерыканскім стандартам.

2. На Ш–IУ курсах паглыбляецца агульна-навуковая і гуманітарная падрыхтоўка студэнтаў. Яны набываюць неабходныя прафесійныя веды, уменні і навыкі ў адпаведнасці з абраным профілем спецыяльнай падрыхтоўкі.

На Ш–IУ курсах навучанне на кафедры будуецца па двум планам, якія адпавядаюць двум асноўным профілям падрыхтоўкі спецыялістаў (кіраўнік аркестра і кіраўнік ансамбля). Некаторыя дысцыпліны з'яўляюцца агульнымі для абодвух прафілізацый. У вучэбны план таксама ўключаны прадметы, якія забяспечваюць набыццё кваліфікацый "выкладчы" (Методыка выкладання спецінструмента і Методыка выкладання дырыжыравання) і "канцэртмайстар" (Канцэртмайстарскі клас для баяністаў і акардэаністаў): (глядзі табліцу № 2 на наступнай старонцы).

На IУ курсе студэнты праходзяць вытворчую практыку (стажыруюцца), у час якой рыхтуюць і абараняюць дыпломную (творчую) работу. У адпаведнасці з вынікамі навучання (аб'ем праслуханых абавязковых і дадатковых курсаў, адзнака за дыпломную работу і сярэдні бал па дысцыплінах (у ЗША, напрыклад, не менш за 4,3) студэнты атрымоўваюць або дыплом аб заканчэнні ВНУ, або ступень бакалаўра. Вызначыўшыяся ў навукова-даследчай рабоце бакалаўры могуць быць пераведзены на новы – магістэрскі ўзровень адукацыі.

Амерыканская статыстыка сведчыць, што адсеў з ВНУ ЗША складае да 40% ад паступіўшых на I курс; толькі 47% студэнтаў атрымліваюць ступень бакалаўра; толькі кожны пяты бакалаўр становіцца магістрам. Пры аднаўленні такой тэндэнцыі на кафедры карціна з колькасным складам студэнтаў магла б выглядаць наступным чынам (колькасць студэнтаў прадстаўлена ў дынаміцы іх руху з курса на курс): табл.2 на с.45.

Табліца 3

| Курс | I | П | Ш | IУ | У |
|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць студэнтаў на дзенным аддзяленні | 20 | 17 | 15 | 13 | 2 |

Такім чынам, па выніках IУ курса з 13-ці чалавек ступень

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Табліца 2.

| Курс | III | | | | IУ | | | | У | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Семестр | 5 | | 6 | | 7 | | 8 | | 9 | |
| Форма заняткаў | груп. | інд. | груп. | інд. | груп. | інд. | груп. | інд. | груп. | інд. |
| АГУЛЬНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ | | | | | | | | | | |
| Аркестравы клас | 6 | – | 6 | – | 6 | – | 6 | – | 6 | – |
| Спецінструмент | – | 2 | – | 2 | – | 2 | – | 2 | – | 2 |
| Інструментоўка | – | I | – | I | – | I | – | I | – | I |
| Аркестравая і ансамблевая літ-ра | 2 | – | – | – | – | – | – | – | – | – |
| Беларуская народна інструментальная творчасць | 2 | – | 2 | I | 2 | I | 2 | I | – | I |
| Методыка выкладання спецінструмента | – | – | – | – | 2 | – | – | – | – | – |
| КІРАЎНІК АРКЕСТРА | | | | | | | | | | |
| Дырыжыраванне | – | 2 | – | 2 | – | 2 | – | 2 | – | 2 |
| Ансамбль (дуэты) | – | 2 | – | 2 | – | – | – | – | – | – |
| ЧАП | – | I | – | – | – | – | – | – | – | – |
| Методыка работы з аркестрам | – | – | 2 | – | – | – | – | – | – | – |
| Методыка выкладання дырыжыравання | – | – | – | – | 2 | – | – | – | – | – |
| КІРАЎНІК АНСАМБЛЯ | | | | | | | | | | |
| Клас ансамбля | 4 | – | 4 | – | 4 | – | 4 | – | 4 | – |
| Методыка работы з ансамблем | – | – | 2 | – | – | – | – | – | – | – |
| Канцэртмайстарскі клас (баян, акардэон) | – | 2 | – | 2 | – | 2 | – | 2 | – | 2 |
| ТЫДНЕВАЯ НАГРУЗКА:[1] | | | | | | | | | | |
| А) кіраўнік аркестра | I0(35,7%) | | I0(35,7%) | | I2(50%) | | 8(33%) | | 6(25%) | |
| Б) кіраўнік ансамбля | I4(50%) | | I4(50%) | | I4(58%) | | I2(50%) | | I0(4I%) | |

I) Згаданы вышэй Загад № 660 прапануе скараціць аб'ём аўдыторнай нагрузкі студэнтаў на IУ–У курсах да 24 гадзін у тыдзень



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бакалаўра атрымаюць 10 чалавек, дыплом аб заканчэнні інстытута - 3, забяруць дакументы за чатыры гады навучання - 7, працягнуць вучобу на пятым курсе - 2.

3. На У курсе бакалаўры паглыбляюць сваю тэарэтычна-прафесійную падрыхтоўку, засвойваюць навукова-даследчыя праграмы, стажыруюцца на вучэбных кафедрах і ў прафесіянальных творчых калектывах, рыхтуюць і абараняюць дыпломную работу на ступень магістра навук. Магістры маюць права на залічэнне ў аспірантуру для падрыхтоўкі і абароны кандыдацкай дысертацыі, або на работу на пасадзе выкладчыка сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў.

4. Навучанне ў аспірантуры, якое доўжыцца 3 гады. Аспіранты, паспяхова абараніўшыя дысертацыі, маюць права на работу ў якасці дацэнта ВНУ.

5. Дактарантура - вышэйшы ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў.

У сувязі з магчымым прысваеннем у недалекім будучым студэнтам званняў бакалаўра і магістра, трэба зазначыць, што ў заходніх ВНУ праводзяць мяжу паміж прафесійным і даследчымі ступенямі бакалаўра і магістра. Даследчыя ступені прысвойваюцца ў галіне: а) прыродазнаўчых навук; б) гуманітарных навук; в) мастацтва; г) кіраўніцтва. Даследчая ступень доктара філасофіі прысвойваецца незалежна ад накірунка навуковай дзейнасці. Прафесійныя ступені бакалаўра і магістра адпавядаюць нашым дыпломам аб заканчэнні ВНУ.

Такім чынам, можна прапанаваць наступны пералік спецыялізацый, прафесійных і даследчых ступеняў для факультэта Мастацкай творчасці:

Спецыяльнасць - педагог-арганізатар мастацкай творчасці.

Спецыялізацыі: - педагог-арганізатар народна-інструментальнай творчасці;
- педагог-арганізатар ... творчасці.

Кваліфікацыі: - кіраўнік аркестра (хора, ансамбля і г.д.);
- канцэртмайстар;
- выкладчык (дырыжыравання, спецінструмента, музыкі, гісторыі сусветнай культуры, спеваў, харэаграфіі).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прафесійныя ступені: - бакалаўр педагогікі (мастацкая творчасць);
- магістр педагогікі (мастацкая творчасць).
Даследчыя ступені: - бакалаўр мастацтва;
- магістр мастацтва;
- доктар філасофіі.

Памяншэнне колькасці студэнтаў кафедры са 120 да 70 чалавек у сувязі са скарачэннем набору і пераходам да шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў адаб'ецца на творчых калектывах кафедры. У 1992-93 вучэбным годзе на кафедры працуюць: аркестр рускіх народных інструментаў (70 чалавек), аркестр беларускіх народных інструмента (30 чалавек); фальклорны аркестр (20 чалавек). У новых варунках прыйдзецца адмовіцца ад аднаго з аркестраў. Улічваючы тэндэнцыю да беларусізацыі вучэбнага працэсу, адраджэння беларускай народнай культуры на кафедры застанецца аркестр беларускіх народных інструментаў, які павялічыцца да 45 чалавек і фальклорны аркестр (25 чалавек). Адпаведна, з сямі ансамбляў народных інструментаў у 1992-93 вучэбным годзе (на Ш курсе - 2 змешаныя, на IУ - 2 змешаныя, на У - 3: дамровы, балалаечны, фальклорны) на кафедры могуць застацца ўсяго два ансамблі - па адному на Ш і IУ курсах. Гэта будуць ансамблі беларускіх народных інструментаў.

Улічваючы інструментальны склад аркестраў і ансамбляў кафедры (беларускія народныя інструменты), трэба пераглядзіць патрабаванні да абітурыентаў: скараціць, а можа і адмовіцца ад прыему па класам "домра" і "балалайка". Патрэбнасці мастацкіх калектываў кафедры ў пэўных інструментах запатрабуе вызначыць іх квоты ў агульнай колькасці абітурыентаў, напрыклад: агульны набор на I курс - 20 чалавек, у тым ліку: цымбалы 6, скрыпка - 6, баян-акардэон - 6, духавыя (флейта, габой, кларнет) - 2.

Прыведзены вышэй план, мяркуемая колькасць студэнтаў - усе гэта пэўным чынам можа адбіцца на штатах кафедры. У 1992-93 вучэбным годзе на кафедре працуе 26 выкладчыкаў, 15 сумяшчальнікаў, 14 канцэртмайстараў (9 штатных і 5 сумяшчальнікаў), 4 лаборанты. Усяго - 59(!) чалавек.

Каб зрабіць больш-менш дакладны прагноз па штатам на некалькі год уперад, удакладнім магчымы колькасны склад студэнтаў па інструментах і профілю падрыхтоўкі:

Табліца 4

| Інструмент | Курс I | II | III | IV | V | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Цымбалы | 6 | 5 | 5 | 4 | 1 | 21 |
| Скрыпка | 6 | 5 | 4 | 3 | - | 18 |
| Баян, акардэон | 6 | 6 | 4 | 4 | 1 | 21 |
| Духавыя | 2 | 2 | 2 | 2 | - | 8 |
| УСЯГО: | 20 | 17 | 15 | 13 | 2 | 68 |
| У тым ліку па профілям падрыхтоўкі: | | | | | | |
| а) кіраўнікоў аркестраў | | | 5 | 4 | 1 | |
| б) кіраўнікоў ансамбляў | | | 10 | 9 | 1 | |

Правёўшы неабходныя разлікі, мы атрымалі дадзеныя, якія сведчаць аб скарачэнні агульнай колькасці гадзін на дзённым аддзяленні спецыялізацыі з 26122 у 1992-93 вучэбным годзе да 12484 праз 5 год. Размеркаванне гадзін па дысцыплінах будзе выглядаць наступным чынам:

Табліца 5

| Прадмет | Гадзіны | Ставак | Заўвагі |
|---|---|---|---|
| Цымбалы | 1789 | 2,0 | |
| Скрыпка | 1236 | 1,25 | |
| Духавыя | 544 | 0,5 | |
| Дудка | 525 | 0,5 | |
| Баян, акардэон | 1400 | 1,5 | |
| Канцэртмайстарскі клас | 564 | 0,5 | |
| Клас ансамбля (дуэты) | 140 | 0,2 | |
| Дырыжыраванне | 3224 | 3,25 | |
| Аркестравы клас | 420 | 0,5 | |
| Інструментоўка | 1077 | 1,0 | |
| Чытанне аркестравых партытур | 232 | 0,25 | |
| Беларуская народна-інструментальная творчасць | 272 | 0,25 | |
| Клас ансамбля | 480 | 0,5 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Прадмет | Гадзін | Ставак | Заўвагі |
| --- | --- | --- | --- |
| Аркестравая і ансамблевая літ-ра | 36 | | |
| Методыка работы з аркестрам і ансамблем | 72 | 0,24 | |
| Методыка выкладання | 180 | | |
| Экзамены, залікі, практыка, стажыроўка | | 1,0 | |
| УСЯГО: | 12484 | I3,5 | |

Па нашых падліках удвая паменшыцца і колькасць канцэртмайстарскіх ставак.

У прадстаўленым плане-прагнозе не ўсе бясспрэчна. Так, не ўлічвалася нагрузка на завочным аддзяленні, разлікі рабіліся зыходзячы з нагрузкі выкладчыка, роўнай 1000(!) гадзін у год (у музычным вучылішчы – 720, на Захадзе – 200-300) і г.д. Магчымы таксама такі варыянт шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў, калі ступень бакалаўра даецца не ў канцы IУ курса, а ў сярэдзіне пятага. У такім выпадку магістэрская падрыхтоўка можа скласці 1,5 года (другі семестр пятага курса і ўвесь шосты курс). Увогуле аўтар разглядае свае разважанні як адзін з магчымых шляхоў удасканалення работы кафедры, наданні ей большых праў з тым, каб на самой справе зрабіць кафедральны калектыў галоўным звяном вучэбнага працэсу. І пераход да шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў можа даць у гэтай стадыі станоўчыя вынікі.

Л.А.Дзямешка
(кафедра бібліятэказнаўства)

## КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЕ БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ

Аб жыцці нашых суродзічаў – беларускай дыяспары – за мяжой у рэспубліцы з'ўляецца ўсе больш звестак, зацікаўленасць да гэтай тэмы ў апошні час значна павялічылася. Таму спрыяе сама эміграцыя, якая вядзе перадачы на беларускай мове па некалькіх радыестанцыях, выдала ў Лондане цікавую кнігу А.Макмілліна "Беларуская літаратура", запрасіла супрацоўніка АН РБ, пісьменніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ